Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
______________С.Л. Шпарло
“19” 12 2023 г.
Рэгістрацыйны № ВД-643вуч.

# УСЕАГУЛЬНАЯ ГІСТОРЫЯ
## Раздзел 2. СЯРЭДНІЯ ВЯКІ

*Вучэбная праграма ўстановы адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны*

2023

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0322-03-2023 па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0322-03 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

**СКЛАДАЛЬНІК**
*Л. У. Ландзіна,* прафесар кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, доктар гістарычных навук, дацэнт.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ**

*В.А.Йоцюс,* загадчык кафедры ўсеагульнай гісторыі і методыкі выкладання гісторыі ўстановы адукацыі “Беларусі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя М. Танка”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,

*Д.А.Мігун,* загадчык кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі Установы вышэйшай адукацыі “Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”, кандыдат гістарычных навук, дацэнт,

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 11 ад 25.05.2023);
прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 05.07.2023)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Для спецыяліста, які працуе ў галіне музеязнаўства і турызма, надзвычай важнымі прадстаўляецца валоданне гістарычнымі ведамі. Яны з’яўляюцца неабходнымі для працы ў краязнаўчых і гістарычных музеях, пры арганізацыі экскурсій ў турыстычнай дзейнасці, а таксама пры вядзенні навукова-даследчыцкай дзейнасці ў музеях. Вучэбная дысцыпліна “Усеагульная гісторыя. Раздзел 2. Сярэднія вякі” з’яўляецца важным для засваення будучымі спецыялістамі па шэрагу прычын. У дадзеную эпоху адбывалася станаўленне і развіццё еўрапейскай цывілізацыі, што падрыхтавала яе сусветнае дамінаванне ў Новы час. Сярэднія вякі – гэта перыяд існавання і лідэрства Візантыі і Арабскага халіфату, без культурных дасягненняў якіх нельга сабе ўявіць Заходнюю Еўропу. Менавіта ў перыяд Сярэднявечча акрэсліваюцца ў поўнай меры спецыфіка і гістарычныя патэнцыі Кітая і Японіі.

Вучэбная дысцыпліна “Усеагульная гісторыя. Раздзел 2. Сярэднія вякі” прадугледжвае комплексны аналіз гістарычных працэсаў, тэндэнцый, падзей у іх параўнанні і супастаўленні па рэгіёнах ад падзення Заходняй Рымскай імперыі да канца XV ст. Гэта разгляд гістарычных лёсаў Заходняй і Усходняй Еўропы, Русі, Візантыі, скандынаўскіх краін, арабскага свету і дакалумбавых цывілізацый, Індыі, Кітая і Японіі, а таксама прасочванне ўплыву на развіццё Еўразіі міграцыйных працэсаў перыяду Вялікага перасялення народаў, існавання Мангольскай і ўсталявання Асманскай імперый.

У вучэбную праграму уключаны тэмы, прысвечаныя міфалогіі, рэлігіі, літаратуры і мастацкай культуры, а таксама развіццю навуковых ведаў. Зроблены акцэнт на вывучэнне гісторыі паўсядзеннасці, што прадугледждвае не толькі ўвагу да матэрыяльнай культуры, але і разуменне індывідуальных і калектыўных уяўленняў, эвалюцыі гендэрных і сямейна-шлюбных адносінаў і г.д.

*Мэтай* выкладання вучэбнай дысцыпліны “Усеагульная гісторыя. Раздзел 2. Сярэднія вякі” з’яўляецца фарміраванне прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў у галіне музеязнаўства і аховы гісторыка-культурнай спадчыны ў кантэксце вывучаемай дысцыпліны, матывацыі для набыцця новых ведаў і іх прымянення ў прафесійным і штодзенным асяроддзі.

*Задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

- вызначэнне месца і ролі Сярэднявеча ў сусветнай гісторыі, падыходаў да перыядызацыі Сярэднявечча, а таксама праблем інтэрпрэтацыі і выкарстання адпаведнай тэрміналогіі;
- усведамленне цэласнасці сусветна-гістарычнага працэсу, сувязі і пераемнасці ў развіцці цывілізацый, краін і народаў;
- адлюстраванне паступовага разгортвання гістарычнага развіцця з выяўленнем краін – лідэраў у канкрэтныя эпохі, з разуменнем нераўнамернасці і пераемнасці гэтага працэса;

- сістэмнае бачанне гістарычнага працэса праз сінхранізацыю, аналогіі, параўнанне, вылучэнне сувязяў прычын і наступстваў;

- выхаванне павагі да гісторыка-культурнай спадчыны розных народаў, суаднясенне дасягненняў сусветнай і айчыннай матэрыяльнай і духоўнай культуры;

- забеспячэнне пераемнасці і ўзаемасувязі матэрыяла выкладаемага курса з ведамі, атрыманымі ў сярэдняй школе, а таксама са зместам сумежных дысцыплін праз міжпрадметныя сувязі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт *павінен ведаць:*

- значэнне перыяду Сярэдніх вякоў у сусветнай гісторыі, крытэрыі перыядызацыі, змест і структуру курса;

- асноўныя тэндэнцыі, працэсы і падзеі ў развіцці цывілізацый, краін і народаў;

- асаблівасці  развіцця заходняй і усходняй цывілізацыйнай мадэлі;

- уплыў сацыяльных і культурных інстытутаў, якія склаліся ў Сярэднія вякі, на гістарычныя працэсы наступных перыядаў.

Студэнт павінен *умець:*

- параўноўваць і інтэрпрэтаваць розныя пункты гледжання, выпрацоўваць і аргументаваць уласныя меркаванні;

- чытаць інфармацыю гістарычных карт, схем, дыяграм, а таксама ілюстрацыйнага матэрыялу;

- прымяняць у кантэксце разгляду сусветнай гісторыі веды па сумежных дысцыплінах (сусветнай мастацкай культуры, філасофіі, сусветнай літаратуры, рэлігіязнаўстве, культуралогіі, айчынай гісторыі і г.д.);

- аналізаваць гістарычныя працэсы і падзеі, ацэньваць гістарычныя з’явы і персаналіі.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны “Усеагульная гісторыя. Раздзел 2. Сярэднія вякі” павінна забяспечыць фарміраванне наступных кампетэнцый:

УК-4 Працаваць у камандзе, талерантна ўспрымаць сацыяльныя, канфесійныя, культурныя і іншыя адрозненні;

УК-7 Валодаць здольнасцю аналізаваць працэсы дзяржаўнага будаўніцтва ў розныя гістарычныя перыяды, выяўляць фактары і механізмы гістарычных змен, вызначаць сацыяльна-палітычнае значэнне гістарычных падзей (асоб, артэфактаў і сімвалаў) для сучаснай беларускай дзяржаўнасці, дасканала выкарыстоўваць выяўленыя заканамернасці ў працэсе фарміравання грамадзянскай ідэнтычнасці

УК-12 Вызначаць і аналізаваць асноўныя этапы, фактары і заканамернасці гістарычнага развіцця грамадства для фарміравання грамадзянскай пазіцыі

БПК-3 Аналізаваць і ацэньваць асноўныя гістарычныя падзеі і працэсы, дасягненні сусветнай і айчыннай культуры, агульныя заканамернасці фарміравання культурнай спадчыны

БПК-4 Інтэрпрэтаваць гісторыю сусветных цывілізацый, вызначаць асаблівасці этнічных супольнасцей, культур і іх эвалюцыю, агульную сацыякультурную сітуацыю.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Усеагульная гісторыя. Раздзел 2. Сярэднія вякі” прадугледжана 168 гадзін, з іх аўдыторных 68. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 46 гадзін, семінарскія заняткі – 22 гадзіны. Рэкамендаваная форма кантролю – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны.
### *Сярэднявечча ў сусветна-гістарычным працэсе. Перыядызацыя і асноўныя паняцці*

Храналагічныя рамкі Сярэднявечча і іх абгрунтаванне. Перыядызацыя, яе крытэрыі і варыянты. Узнікненне і значэнне тэрміна “Сярэднявечча”. Паняцці “цывілізацыя”, “феадалізм”, “саслоўе”, “саслоўна-прадстаўнічая манархія” і праблема іх дэфініцыі ў гістарычнай навуцы. Сінтэзны і бессінтэзны варыянты развіцця еўрапейскага феадалізма.

Цывілізацыйная разнастайнасць Сярэднявечча і месца ў ей Еўропы. Усход і Захад як варыянты цывілізацыйнага развіцця. Значэнне міграцый і нашэсцяў гуннаў, авараў, нарманаў, манголаў для развіцця сярэднявечнага свету. Візантыйская цывілізацыя і Арабскі халіфат як лідэры цывілізацыйнага развіцця ў раннім і высокім Сярэднявеччы. Стварэнне матэрыяльнай і духоўнай асновы для цывілізацыйнага лідэрства Еўропы ў Новы час. Фундаментальнае значэнне сярэднявечнай культуры. Афармленне этнічных супольнасцей, моў і нацыянальных культур.

### Раздзел І. Еўропа ў перыяд Сярэднявечча (V–XV ст.)
### *Тэма 1. Еўропа падчас “вялікага перасялення народаў”. Стварэнне і развіццё варварскіх каралеўстваў*

Паняцце “варвары” ў разуменні насельніцтва Заходняй і Усходняй Рымскай імперыі. Буйнейшыя варварскія плямены, іх месцы рассялення і міграцыі. Гаспадарчыя заняткі і грамадскі лад варварскіх пляменаў. Кантакты варвараў з Рымскай імперыяй. Варварызацыя рымлян і раманізацыя варвараў.

Разбурэнне радавога ладу і фарміраванне феадальнага грамадства у межах правінцый Рымскай імперыі. Сінтэзны варыянт феадалізацыі. Варварскія каралеўствы – Вандальскае, Астгоцкае, Вестгоцкае, Бургундскае, Лангабардскае, Франкскае і г.д.

Варыянты паводзінаў варварскіх пляменаў на заваяваных тэрыторыях. Пераразмеркавнне зямельнай маёмасці і панаванне каланата. Абшчынны лад. Перайманне варварамі рымскіх гаспадарчых тэхналогій і рымскага права. Стварэнне новай сацыяльнай структуры на сінтэзнай аснове. Прынецце хрысціянства варварскімі пляменамі.

### *Тэма 2. Англія да нарманскага заваявання.*

Старажытнае насельніцтва Брытанскіх выспаў. Рымскае панаванне ў Брытаніі і спецыфіка развіцця яе розных частак пасля зыходу рымлян. Нашэсця англаў, саксаў і ютаў. Стварэнне англасаксонскіх каралеўстваў. Гептархія Барацьба за лідэрства паміж англасаксонскімі каралеўствамі. Нартумбрыя, Мерсія, Уэсекс. Грамадскі і дзяржаўны лад англасаксонскіх каралеўстваў. Пабудова і функцыянаванне суседскай абшчыны. Феадалізацыя.

Хрысціянізацыя Брытаніі. Ірландская і рымская місіі. Брытанскія айцы царквы. Дзейнасць Беды Паважанага.

Нашэсці датчан і нарманаў. Барацьба англасаксонскіх каралеўстваў. Паступовае замацаванне заваеўнікаў у Брытаніі. Кароль Альфрэд Вялікі і яго барацьба з датчанамі. Вобласць дацкага права. Датчане у Англіі. Канут Вялікі.

Нармандскія герцагі і іх дынастычныя сувязі. Усобіцы пасля смерці Канута Вялікага і ўкараненне нармандцаў у Брытаніі. Супярэнасці паміж нармандцамі і англасаксамі. Гаральд і Вільгельм. Прэтэнзіі нармандскага герцага на англасаксонскі прастол. Эдуард Спаведнік і Вільгельм Заваёўнік. Бітва пры Гасцінгсе і яе наступствы.

### *Тэма 3. Дзяржава франкаў, яе ўзнікненне, развіццё і распад*

Франкскае каралеўства як прыклад найбольш поўнага і ўраўнаважанага сінтэза ў складанні феадальных адносін. Паходжанне франкаў і іх першыя правадыры. Салічаскія і рыпуарскія франкі. Заснаванне дынастыі Меравінгаў. Заваёвы франкаў у V–VIII ст. Барацьба франкаў з арабамі.

Сістэма кіравання ў Франкскім каралеўстве і яго распад пры пераемніках Хлодвіга. Аб'яднанне краіны маёрдомамі Аўстразіі і заснаванне дынастыі Каралінгаў. Феадалізацыя грамадства. Бенефецыяльная рэформа Карла Мартэла. Шляхі пападання ў феадальную залежнасць. Прэкарый і яго віды. Імунітэт. Складанне сістэмы феадальнай іерархіі. Царкоўнае землеўладанне. Феадальная вотчына.

Пераход каралеўскага тытула да Піпіна Кароткага. Пагадненне франкскага караля і папы рымскага. Карл Вялікі і яго заваёўніцкія паходы. Абвяшчэнне Франкскай імперыі. Каралінгскае адраджэнне.

Пачатак распаду імперыі пры нашчадках Карла Вялікага. Вердэнскі падзел і стварэнне асновы сучасных Францыі, Італіі, Германіі. Заканчэнне дынастыі Каралінгаў.

### *Тэма 4. Грамадскі лад і сацыяльныя адносіны франкаў паводле “Салічаскай праўды”*

Рассяленне франкаў і назвы франкскіх пляменаў. “Салічаская праўда” як гістарычная крыніца. Абшчынны лад і аладыяльнае землеўладанне. Сацыяльная структура франкскага грамадства і яе разнастайнасць. Суд і права ў франкскім грамадстве. Суадносіны звычаёвага і рымскага права. Віды злачынстваў і пакаранняў.

Шляхі пападання ў феадальную залежнасць. Росквіт феадальных адносінаў пры Карле Вялікім. Феадальная вотчына і яе характарыстыкі. Трансфармацыя ўмоў феадальнага землекарыстання.

### *Тэма 5. Эканамічнае развіццё Еўропы ў X–XV ст.*

Аграрны характар эканомікі ў Сярэднявеччы. Гаспадарчы застой у перыяд “цёмных вякоў”. Эканамічны ўздым еўрапейскага грамадства ў X–XI

ст. Выкарыстанне двухполля і трохполля, жалезнага плуга, ўгнаенняў, унутраная каланізацыя, выкарыстанне карысных выкапняў. Аддзяленне рамяства ад сельскай гаспадаркі. Узнікненне сярэднявечных гарадоў. Дэмаграфічны ўздым. Рост гарадаў, змяненне характару феадальнай рэнты. Паступовая ліквідацыя прыгонніцтва ў Еўропе.

Перыяд дэмаграфічнага спаду, войн і эпідэмій. "Чорная смерць" і яе наступствы. Феадальная рэакцыя. Недахоп рабочай сілы. Сацыяльныя канфлікты ў грамадстве, стварэнне сялянскіх таварыстваў. Жакерыя, паўстанне Уота Тайлера, распаўсюджанне ерасей і г.д.

### *Тэма 6. Сярэднявечныя гарады*

Гарад познерымскія і сярэднявечныя. Роля познерымскіх гарадоў у раннім Сярэднявеччы. Шляхі і месцы ўзнікнення сярэднявечных гарадоў. Функцыі сярэднявечнага горада. Горад і сельскае наваколле. Роля гарадоў у эканамічным, палітычным, культурным і рэлігійным жыцці.

Барацьба гарадоў з сеньерамі. Камунальны рух. Роля італьянскіх гарадоў у палітычным і эканамічным развіцці рэгіёна. Гарады як саюзнікі каралеўскай улады ў барацьбе ў буйнымі феадаламі і справе цэнтралізацыі краіны. Наданне гарадам правоў і прывілеяў, наяўнасць гараджан у саслаўна-прадстаўнічых органах позняга сярэднявечча. Гарады Германіі, Францыі, .Англіі Роля гарадоў у перыяд феадальнай раздробленасці. Ганзейскія гарады. Рост палітычнай магутнасці гарадаў у сярэднявеччы.

Знешні выгляд і ўнутраная арганізацыя горада. Умовы паўсядзеннага жыцця гараджан. Рамествы. Цэхі, іх арганізацыя і цэхавая рэгламентацыя. Значэнне цэхаў у жыцці гарадоў. Сацыяльная дыферэнцыяцыя гарадскога насельніцтва і сацыяльныя канфлікты ў гарадскім асяроддзі.

### *Тэма 7. Італія ў X–XV ст.*

Палітычнае становішча італьянскіх зямель пасля падзення Заходняй Рымскай імперыі. Папская вобласць. Панаванне франкаў і лангабардаў. Уплыў на Італію Візантыі і нарманаў. Розніца ў развіцці паўночных і паўдневых зямель. Італія як аб'ект барацьбы пап рымскіх і германскіх імператараў. Гвельфы і гібеліны.

Уздым раместваў і гандлю ў гарадах Ламбардыі і Тасканы. Венецыя, Генуя, Піза як цэнтры міжнароднага гандлю. Барацьба гарадоў з сеньерамі. Камунальная рэвалюцыя. Падпарадкаванне гарадамі сельскай акругі.

Зараджэнне і развіццё першых мануфактур. З'яўленне і пашырэнне банкаўскай справы. Гандлевае дамінаванне італьянскіх гарадоў. Сацыяльная дыферэнцыяцыя ў гарадах і сацыяльныя канфлікты. Паўстанне чомпі.

Гарады – дзяржавы і барацьба паміж імі. Алігархічныя рэспублікі. Тыраніі Медычы, Сфорца, Вісконці, Ганзага і інш. Рух Саванаролы ў Італіі.

### *Тэма 8. Германскія землі ў X–XV ст.*

Усходнія землі Франкскага каралеўства пасля Вердэнскага падзелу. Нацыянальны і моўны склад насельніцтва. Палітычны ўздым германскіх зямель пры Саксонскай дынастыі. Праблемы аб'яднання краіны. Падпарадкаванне германскіх зямель пры Атоне І. Заваяванне славянскіх зямель, перамога над венграмі, захоп Паўночнай Італіі. Каранацыя Атона і стварэнне Свяшчэннай Рымскай імперыі.

Аслабленне імперыі і ўстанаўленне Франконскай (Салічаскай) дынастыі. Узрастанне магутнасці імператарскай улады пры Генрыху ІІІ, ўмяшальніцтва яго ў справы царквы. Барацьба Генрыха IV з папай за інвестытуру. Вормскі канкардат і яго вынікі. Імперыя пры Штаўфенах. Барацьба пап і імператараў за Італію.Германскія імператары і крыжовыя паходы. Палітычная барацьба і перамога Габсбургаў.

Аграрнае развіццё і ўнутраная каланізацыя. Панаванне буйных вотчын. Гаспадарчы ўздым у XIV–XV ст. Становішча сялян і аграрныя адносіны на землях на захад і на ўсход ад Эльбы. Узрастанне самастойнасці гарадоў і ўздым гандлю і рамесстваў. Ганзейскія гарады. “Усходняя каланізацыя”.

Праблемы палітычнага развіцця ў XIV–XV ст.. Узмацненне ўлады князёў. Чаргаванне дынастый Люксембургаў і Габсбургаў. Карл IV і “Залатая була”. Сацыяльныя рухі ў гарадах і на вёсцы. Стварэнне Швейцарскага саюза.

### *Тэма 9. Англія ў X–XV ст.*

Бітва пры Гасцінгсе. Абвяшчэнне Вільгельма Нармандскага англійскім каралем. Асаблівасці англійскага варыянту феадалізацыі. ”Кніга страшнага суда”. Англійскія гарады і асаблівасці іх развіцця. Англійская феадальная іерархіяі яе спецыфіка. Умацаванне каралеўскай улады (каралеўская курыя, “Палата шахматнай дошкі”, ўлада шэрыфаў і г.д.). Феадальныя усобіцы пасля смерці Генрыха І і заснаванне дынастыі Плантагенетаў. Англійскія валоданні ў Францыі. Умацаванне каралеўскай улады і рэформы Генрыха ІІ Плантагенета. Заваяванне Ірландыі і спробы падпарадкавання Шатландыі.

Эканамічнае і палітычнае развіццё Англіі ў XIII ст..Гаспадарчы ўздым, рост гарадоў, камутацыя рэнты, маёмасная дыферэнцыяцыя сялянства. Палітычная барацьба пры Іаане Беззямельным. Страта французскіх тэрыторый і капітуляцыя перад папай. Паўстанне баронаў і прыняцце Вялікай хартыі вольнасцей. Грамадзянская вайна і заснаванне парламента.

Англія ў XIV–XV ст. Заняпад даменіяльнай гаспадаркі, камутацыя рэнты, асабістае вызваленне сялян. Узнікненне наемнай працы, рост гарадоў, з'яўленне “новага дваранства”. Сацыяльная барацьба і рух за рэформу царквы. Ідэі Дж. Уікліфа. Паўстанне У. Тайлера. Англія ў Стогадовай вайне. Палітычная нестабільнасць. Прыход да ўлады дынастыі Ланкастэраў. Паўстанне Дж. Кэда. Барацьба Ланкастэраў з Йоркамі. Вынік вайны Белай і Алай Ружы. Пачатак дынастыі Цюдораў.

### *Тэма 10. Францыя ў X–XV ст.*

Абвяшчэнне Гуго Капета каралем і пачатак дынастыі Капетынгаў. Характар каралеўскай улады і ступень развітасці дзяржаўных інстытутаў. Пачатак цэнтралізацыі дзяржавы. Падпарадкаванне феадалаў, пачатак саюза з гараджанамі пры Людовіку VI і Людовіку VII. Філіп II Аўгуст. Далучэнне новых тэрыторый. Барацьба з Англіяй і адваяванне французскіх зямель. Альбігойскія войны і далучэнне паўднёвых тэрыторый Францыі.

Умацаванне ўлады пры Людовіку Святым. Удасканаленне судовай і фінансавай сістэм, бюракратычнага апарата. Легісты і значэнне іх дзейнасці для фарміравання ідэй цэнтралізацыі дзяржавы і абсалютнай манархічнай улады. Поспехі цэнтралізацыі пры Філіпе Прыгожым. Далучэнне новых тэрыторый. Сутыкненне з папай. Узнікненне Генеральных Штатаў. Сутнасць саслоўна-прадстаўнічай манархіі. Парламенты і іх роля ў Францыі.

Стогадовая вайна, яе прычыны і этапы. Бітвы пры Крэсі і Пуацье. Палон караля. Парыжскае паўстанне. Жакерыя. Феадальныя усобіцы і дынастычны крызіс. Бургіньёны і арманьякі. Паўстанне кабашьенаў. Саюз бургундцаў з англічанамі. Дынастычныя планы англічан і пагроза страты незалежнасці Францыяй. Жана Д'Арк і аблога Арлеана. Каранацыя Карла VII і лёс Жаны Д'Арк. Заканчэнне і вынікі Стогадовай вайны.

Аднаўленне і цэнтралдізацыя краіны пры Людовіку XI. Змены ў гаспадарчым развіцці. Пратэкцыяніcцкія тэндэнцыі ва ўнутранай палітыцы, барацьба з Карлам Смелым. Далучэнне Ніверно, Пікардыі, Бургундыі, Праванса. Завяршэнне ў асноўным працэса цэнтралізацыі. Складанне гаспадарчых, ідэалагічных і палітычных умоў для пераходу да абсалютызму.

### *Тэма 11. Іспанія ў XI–XV ст.*

Заваяванне арабамі Пірэнейскага паўвострава. Рэканкіста і яе ўплыў на лад жыцця і псіхалогію еўрапейскага насельніцтва. Спецыфіка тэрытарыяльнага і этнічнага складу Пірэнейскага паўвострава. Ідэалагічная падтрымка Рэканкісты каталіцкай царквой і асаблівая роля каталіцызма у Іспаніі. Гаспадарчае развіццё. Становішча гарадоў і іх узвышэнне. Завяршэнне Рэканкісты і заваяванне Гранады.

Асаблівасці палітычнага і сацыяльнага складу іспанскіх зямель і спецыфіка іспанскай арыстакратыі. Адрозненні Кастыліі і Арагона. Дынастычны шлюб Ізабэлы Кастыльскай і Фердынанда Арагонскага. Цяжкасці пабудовы адзінай дзяржавы. Супраціўленне іспанскіх гарадоў. Роля картэсаў. Узвышэнне ролі каталіцкай царквы як апоры манархіі. З'яўленне інквізіцыі. Рэпрэсіі ў адносінах да мусульман і іудзееў. Барацьба з ерэтыкамі. Устанаўленне іспанскай манархіі і яе характэрныя рысы.

### *Тэма 12. Каталіцкая царква і папства ў XI–XV ст..*

Умацаванне ўлады пап у высокім Сярэднявеччы. Клюнійскі рух і дзейнасць папы Грыгорыя VII. Барацьба пап і імператараў за інвестытуру.

Сутыкненне інтарэсаў папства і імперыі ў Паўночнай Італіі. Гвельфы і гібеліны. Вормсскі канкардат і яго наступствы.

Тэрытарыяльныя прэтэнзіі і тэалагічныя супярэчнасці паміж заходняй і ўсходняй хрысціянскімі цэрквамі. “Вялікая схізма”. Умацаванне ўлады пап у XII–XIII ст. Інакенцій III. “Дэнарый Святога Пятра”. Практыка інтэрдыкту. Дагмат аб непаграшымасці папы. Канфлікт папства са свецкай уладай падчас стварэннея цэнтралізаваных дзяржаў. Сутыкненне з Філіпам IV і Авіньёнскі палон пап. Стварэнне галіканскай царквы. Папы і антыпапы.

### *Тэма 13. Крыжовая паходы*

Перадумовы і прычыны крыжовых паходаў. Задачы, накірункі і сацыяльны склад удзельнікаў паходаў. Клермонскі сабор і першы крыжовы паход. Узяцце Іерусаліма. Авалоданне усходнім Міжземнамор’ем. Дзяржавы крыжакаў (Іерусалімскае каралеўства, Антыёхійскае княства, графствы Трыпалі і Эдэса). Стварэнне манаска-рыцарскіх ордэнаў. Узяцце Іерусаліма Саладзінам і Трэці крыжовы паход.

Чацверты крыжовы паход. Крыжакі і венецыянцы. Узяцце Канстанцінапаля. Заснаванне Лацінскай імперыі. Крыжовы паход дзяцей. Познія крыжовыя паходы. Экспансія крыжакаў на поўначы і усходзе Еўропы. Лёс дзяржаў, створаных крыжакамі. Значэнне крыжовых паходаў дя развіцця еўрапейскай цывілізацыі ў Сярэднявеччы.

### *Тэма 14. Скандынаўскія краіны ў Сярэднявеччы. Варагі і Русь*

Этнічны склад насельніцтва і спецыфіка скандынаўскіх тэрыторый. Гаспадарчыя заняткі і грамадскі лад. Рэлігія, міфалогія, пісьменасць раннесярэднявечнай Скандынавіі. Умацаванне ўлады конунгаў. Будаўніцтва флота і экспедыцыі вікінгаў. Заваяванні датчан у Англіі, Францыі, Паўночнай Германіі. Заснаванне Нармандыі. Нармандскае заваяванне Англіі. Засяленне Ісландыі і плаванні нарманаў да Амерыкі. Нарманы і Візантыя. Значэнне паходаў нарманаў для каланізацыі і гандлю еўрапейскіх зямель.

Суадносіны тэрмінаў “варагі”, нарманы”, “вікінгі”, “русы”. Версія паходждання назвы “Русь” у гістарычнай літаратуры. Пранікненне варажскіх дружын на землі ўсходніх славян. Рурык і Рурыкавічы. Нарманская тэорыя.

Асаблівасці генэзіса феадалізма і грамадска-палітычны лад скандынаўскіх краін. Скандынавія пасля паходаў вікінгаў. Стварэнне скандынаўскіх дзяржаў. Гарады і бюргерства. Барацьба з феадальнай арыстакратыяй і праблемы цэнтралізацыі. З’яўленне саслоўна-прадстаўнічых органаў. Войны з Ганзай. Кальмарская унія, яе ўмовы і наступствы. Спецыфіка краін – удзельнікаў уніі і супярэчнасці паміж імі. Сацыяльная барацьба і фарміраванне саслоўна-прадстаўнічых органаў.

### *Тэма 15. Кіеўская Русь (Старажытнаруская дзяржава) у IX–XIII ст.*

Суадносіны паняццяў “Кіеўская Русь” і Старажытнаруская дзяржава”. Рассяленне, гаспадарчыя заняткі і грамадскі лад усходнеславянскіх пляменаў. Заснаванне Кіева. Кіеў і Ноўгарад. Славяне і варагі. Рурык і яго пераемнікі. Умацаванне Кіева пры Алеге і Ігары. Паходы на Візантыю. Барацьба з хазарамі, печанегамі, полаўцамі. Паўстанне драўлян. “Урокі” і “пагосты”. Княгіня Вольга. Праўленне князя Святаслава і яго ваенныя паходы. Барацьба Уладзіміра за ўладу і яе вынікі. Прынятце хрысціянства і яго значэнне.

Імкненне Кіева да дамінавання. Кіеўскія і полацкія князі. Росквіт Кіеўскай Русі пры Уладзіміры і Яраславе Мудрым. Фарміраванне феадальнага грамадства. ”Руская праўда”. Сацыяльная структура насельніцтва і яе трансфармацыя. Гарады Кіеўскай Русі. Прычыны і пачатак феадальнай раздробленасці. З’езд князёў у Любечы і яго рашэнні. Спробы Уладзіміра Манамаха і яго сына Мсціслава спыніць працэс адпадзення тэрыторый ад Кіева. Палон полацкіх князёў і адпраўка іх у Візантыю. Буйнейшыя ўсходнеславянскія княствы і іх развіццё ў высокім Сярэднявеччы.

### *Тэма 16. Маскоўская Русь у XIII–XV ст.*

Фактары ўзвышэння Масквы. Праўленне першых князёў. Збіранне зямель вакол Масквы. Пагаршэнне знешнепалітычнай сітуацыі ў пачатку XIII ст. Неўская бітва і Лядовае пабоішча. Знешнепалітычны фактар і стварэнне Вялікага княства Літоўскага. Захаванне крыжацкай прысутнасці на землях ВКЛ. “Русь Маскоўская” і “Русь Літоўская”.

Уварванне мангола-татараў. Бітва на Калцы. Разгром Разані. Узяцце Кіева. Усталяванне мангола-татарскага панавання. Рускія землі ў сістэме Залатой Арды і адносіны залатаардынскіх ханаў з маскоўскімі князямі. Іван Каліта і вынікі яго дзейнасці. Мерапрыемствы Маскоўскіх князёў па ўмацаванню ўлады і збіранню зямель. Саперніцтва Масквы і Цверы. Адносіны Масквы і Вялікага княства Літоўскага. Падпарадкаванне Ноўгарада. Кулікоўская бітва. Стаянне на рацэ Вугры і вызваленне ад мангола-татарскага прыгнету. “Судзебнік” Івана III. Пачатак афармлення прыгоннага права.

Ідэя Фларэнційскай уніі. Адасабленне рускай праваслаўнай царквы ад Канстанцінопальскага патрыярха. Падзенне Візантыі і імкненне Маскоўскай Русі да ролі адзінай захавальніцы праваслаўя. Ідэалагема “Масква – трэці Рым”. Шлюб Івана III і Соф’і Палеалог. З’яўленне тытула”гасудар усяя Русі”.

### *Тэма 17. Еўрапейская культура ранняга і высокага Сярэднявечча*

Светаўспрыманне сярэднявечнага чалавека. Час і прастора. Духоўнае і цялеснае. “Град зямны” і “град нябесны”. Ідэя выратавання і барацьбы дабра са злом. Барацьба з ведзьмамі. Хрысціянская дагматыка і схаластыка

(Аўгусцін Блажэнны, Фама Аквінскі, Альберт Вялікі і інш.). Каралінгскае і Атонаўскае адраджэнне.

Сістэма адукацыі. Універсітэты. Будова універсітэта, набор дысцыплін, арганізацыя навучання. Латынь як мова навукі і рэлігіі сярэднявечнай Еўропы. Сярэднявечная філасофія. Наміналісты і рэалісты. П. Абеляр. Містыка (Бернар Клервоскі). Навуковыя веды сярэднявечча (Р. Бэкан, Т. Гросэтэст).

Развіццё літаратуры. Гераічны эпас. Легенды аб каралі Артур, “Беавульф”, “Песня аб Нібелунгах”, “Песня аб Раландзе”, “Песня аб Сідзе” і інш. Міфалогія і эпас скандынаўскіх народаў. Правансальскае адраджэнне.

Паэзія трубадураў. Рыцарская літаратура (Крэц’ен дэ Труа, Бертран дэ Борн і інш.). Рыцарскі раман. “Раман аб Розе”, “Трыстан і Ізольда” і г.д. Рыцарскі этас. Куртуазнасць. Гарадская літаратура (“Раман аб Лісу” і інш.).

Выяўленчае мастацтва і архітэктура. Кніжная мініяцюра. Раманская архітэктура і яе рысы. Рост гарадоў і пашырэнне будаўніцтва. Узнікненне і развіццё гатычнай архітэктуры. Раманскае і гатычнае мастацтва. Скульптура.

Умовы і лад жыцця розных катэгорый насельніцтва. Сямейна-шлюбныя адносіны. Бацькі і дзеці. Выхаванне розных катэгорый насельніцтва. Умовы жыцця. Жыллё, харчаванне, вопратка розных сацыяльных груп.

### *Тэма 18. Еўрапейская культура позняга Сярэднявечча*

Змяненні ў ладзе жыцця ў познім Сярэднявеччы. Уплыў крыжовых паходаў. Выхаванасць і куртуазнасць. Маральна-этычныя ўзоры для розных катэгорый насельніцтва. Рыцарскі гонар. Ідэальны прыдворны. “Новы прыемны стыль” італьянскай паэзіі (Г. Гвініцэлі, Б. Кавальканці і г.д.). Бургундскі двор. Гарадская культура. Пашырэнне адукаванасці ў грамадстве. Гістарычныя хронікі. Рэлігійнасць грамадства. Фанатызм і ерасі. Макабрычнае мастацтва як асаблівасць сярэднявечнага светаўспрыняцця.

Рост гарадоў і росквіт гатычнай архітэктуры. “Пламянеючая готыка”. Буйнейшыя ўзоры гатычнай архітэктуры. Гатычная скульптура. Кніжная мініяцюра. Карнавальная культура. Тэатралізаваныя відовішчы (міраклі). “Карміна Бурана”. П’есы-маралітэ. Ваганты, галіярды, мінізінгеры.

### *Тэма 19. Культура ранняга еўрапейскага Адраджэння*

Перадумовы ўзнікнення культуры ранняга Адраджэння. Асаблівасці эканамічнага і культурнага развіцця італьянскіх гарадоў. Уваходжанне ў сярэднявечную культуру антычнай спадчыны. Мэтанакіраваны пошук і вывучэнне антычных помнікаў.

З’яўленне ідэі гуманізма. Новыя маральныя прыярытэты. Змяненне стаўлення да адукаванасці і заняцця мастацтвам. Гуманісты (К. Салютаці, Дж. Манецы, Дж. Піка дэла Мірандала, М. Фічына і г.д.). Ідэі гуманізма ў творах Дантэ, Ф. Петраркі, Дж. Бакачча і інш. Новыя каноны мастацтва.

Цялесны ідэал Адраджэння. Творы Джота, Мазача, Данатэла, Брунелескі і г.д..

### *Тэма 20. Руская культура X–XV ст.*

Прыняцце хрысціянства і яго значэнне для развіцця ўсходнеславянскай культуры. Мураванае дойлідства. Пабудова Кіеўскага, Наўгародскага, Полацкага сабораў у гонар св. Сафіі. Іканапіс і фрэскі.

Манастырскія школы. Саборнасць і манаства. Стоўпніцтва, схімніцтва, пячорнае затворніцтва. Заснаванне Кіева-Пячэрскай Лаўры, Ільінскага падземнага манастыра ў Чарнігаве, Пячэрскага манастыра пад Ізборскам і г.д.

Славянская сістэма пісьма. Кірыл і Мефодый. Усталяванне кірылічнага алфавіта. Берасцяныя граматы. Рукапісныя кнігі. Астамірава і Мсціславава Евангеллі. Летапісанне. “Аповесць мінулых часоў”. Мясцовыя летапісы. “Ізборнік” князя Святаслава. “Павучэнні Уладзіміра  Манамаха дзецям”, “Павучэнні Іаана Златавуста”.

Быліны. “Слова аб паходзе Ігаравым”, “Слова Данілы Заточніка”, “Маленне Данілы Заточніка”, “Аповесць аб разарэнні Разані бытыям”, “Слова аб пагібелі зямлі Рускай”, “Казанне іб жыцці Аляксандра Неўскага”.

### *Тэма 21. Узнікненне і развіццё славянскіх краін у раннім і высокім Сярэднявеччы*

Меркаванні аб прарадзіме славян. Славяне ў эпоху “вялікага перасялення народаў”. Падзел славян на паўднёвых, заходніх і усходніх. Сацыяльны лад і гаспадарчыя заняткі славян. Стварэнне славіній. Дзяржава Сама і Вялікамараўскае княства.

Групы заходніх славян. Стварэнне Польскай дзяржавы. Князь Мешка. Прыняцце хрысціянства. Ваенныя паходы Баляслава І. Прыняцце Баляслававам тытула караля. Палітычная раздробленасць Польшчы (мажнаўладства).

Стварэнне Чэшскай дзяржавы. Прадастаўленне Ўраціславу ІІ каралеўскага тытула. Знаходжанне Чэхіі ў складзе Германскай імперыі.

Саюз славян і балгар. Хан Аспарух і стварэнне Першага Балгарскага царства. Прыняцце хрысціянства. Росквіт Балгарыі пры Сімяоне Вялікім. Паходы на Канстанцінопаль і прыняцце тытула цара. Падзенне Першага Балгарскага царства і пападанне яго пад уладу Візантыі. Паўстанне  супраць Візантыі і заснаванне Другога Балгарскага царства.

Заваяванне венграмі Прыдунайскай тэрыторыі. Заснаванне Венгерскага каралеўства. Стварэнне дзяржавы харватаў. Ператварэнне Сербіі ў каралеўства пры Стэфане Першавенчаным. Знаходжанне паўднёвых славян пад уплывам Візантыі.

### *Тэма 22. Славянскія краіны ў познім Сярэднявеччы*

Аб’яднанне Польскай дзяржавы. Уладзіслаў Лакетак і аднаўленне каралеўскага тытула. Тэрытарыяльнае пашырэнне краіны. Адносіны з Вялікім княствам Літоўскім. Казімір Вялікі і ўмацаванне каралеўскай улады.

Асаблівасці сацыяльна-палітычнага развіцця Польшчы. Роля шляхты. Кошыцкі прывілей. Спыненне дынастыі Пястаў. Крэўская унія Польшчы і Вялікага княства Літоўскага. Заснаванне дынастыі Ягелонаў. Адносіны Кароны і Княства. Барацьба з крыжакамі. Грунвальдская бітва.

Знаходжанне Чэхіі ў складзе Германскай імперыі. Кіраванне Люксембургскай дынастыі. Германізацыя. Эканамічны ўздым краіны. Апазіцыя супраць каталіцкай царквы і германізацыі. Ян Гус і яго вучэнне. Плыні ў гусіцкім руху. Кантакты гусітаў з Вітаўтам. Гусіцкія войны і іх вынікі.

Росквіт Сербіі пры Стэфане Душане. Аслабленне дзяржавы і завяяванне яе туркамі. Бітва на Косавым полі. Устанаўленне турэцкага панавання над Балгарыяй. Канец Другога Балгарскага царства. Барацьба венграў з туркамі. Бітва пры Махачы і яе наступствы.

### *Тэма 23. Візантыя ў V–XV ст.*

Падзел Рымскай імперыі і ўтварэнне Візантыі. Асаблівасці сацыяльнага, этнічнага, палітычнага і рэлігійнага развіцця тэрыторый Візантыі. Тэрміны “рамеі” і “візантыйцы”. Аграрны лад. Гарады. Рамествы і гандаль.

Спецыфіка спадчыннасці імператарскай улады і яе адносіны з хрысціянскай царквой. Роля еўнухаў у кіраванні імперыяй. Адміністрацыйны апарат імперы, сістэма тытулаў і пасад. Кіраванне Юстыніяна. Паходы ў Італію, паўночную Афрыку, Іспанію. Войны з персамі. Напады протабалгар, авараў, славян. Нетрываласць заваёў Юсцініяна. Унутраная палітыка Юсцініяна. Кадыфікацыя права. “Земляробчы закон”. Абвастрэнне сацыяльнай напружанасці. Паўстанне “Ніка”.

Крызіс імперыі ў VII ст. Сацыяльна-палітычная структура Візантыі ў VIII–XII ст. Фемны лад. Аграрнае заканадаўства імператараў Македонскай дынастыі. Адносіны царквы і імператарскай улады. Іканаборчаскі рух. Знешнепалітычнае становішча імперыі. Барацьба з балгарамі і арабамі. Пагаршэнне знешнепалітычнага становішча ў XI–XII ст. Адасабленне і страта правінцый. Візантыя і крыжовыя паходы.

Аднаўленне імперыі пры Міхаіле Палеалогу. Позневізантыйскі феадальны лад. Умяшальніцтва турак у міжусобную барацьбу ў Візантыі. Спробы Іаана Палеалога стварыць антытурэцкую кааліцыю. Фларэнційская унія. Прызнанне Візантыяй васальнай залежнасці ад туркаў. Узяцце туркамі Канстанцінопаля і геапалітычныя наступствы падзення Візантыі.

### *Тэма 24. Культура Візантыі*

Спецыфіка культуры усходняй Рымскай імперыі. Дзяржаўная ідэя Візантыі – спадкаеміцы Рыма. Касмапалітычнасць візантыйскай культуры. Культурнае жыццё візантыйскага горада. Іпадром у Канстанцінопалі.

Рэлігійная складаючая візантыйскай культуры. Манаства. Багаслоўскія спрэчкі і вынікі царкоўных сабораў. Ідэйны сэнс іканаборчаства. Ісіхазм.

Візантыйская архітэктура. Сімволіка храма. Храм св. Сафіі ў Канстанцінопалі. Візантайская мазаіка. Іканапіс.

Навуковыя веды Візантыі. "Візантыйскі энцыклапедызм". Канстанцін Парфірародны, яго мерапрыемствы ў галіне сістэматызацыі навуковых ведаў. Візантыйскія рукапісы. М. Псел і разнастайнасць яго твораў. Гістарычныя веды (П. Кесарыйскі, Г. Комніна, М. Ханіят).

Тэхнічныя веды Візантыі. Візантыйскі флот. "Грэчаскі агонь".

## Раздзел ІІ. Нееўрапейскія цывілізацыі ў Сярэднявеччы

### *Тэма 25. Арабы. Узнікненне ісламa. Стварэнне Арабскага халіфата*

Прыродныя ўмовы і насельніцтва дамусульманскай аравіі. Дзяржава Хім' ярытаў. Арабы-бедуіны, іх грамадскі лад і заняткі. Пранікненне ў Йемен хрысціянства.

Узнікненне ісламa і аб'яднанне арабаў. Пачатак пропаведзі Мухамеда ў г. Мека. Перасяленне Мухамеда з Мекі ў Медыну. Асоба Мухамеда і яго вучэнне. Каран – свяшчэнная кніга мусульман. Кадыфікацыя Карана пасля смерці Мухамеда. Грамадзянская вайна і раскол мусульман і шыітаў і сунітаў. Харыджыты.

Першыя халіфы і іх дзейнасць. Падаўленне сепаратызму ў Аравіі. Вайна з Візантыяй і Іранам. Заваяванне Арменіі і часткі Грузіі. Тэрытарыяльныя заваёвы ў Егіпце, Іраку, Сірыі. Заваяванне арабамі Пірэнейскага паўвострава. Барацьба арабаў з франкскімі каралямі. Палітыка на далучаных тэрыторыях. Халіфат Амейядаў. Арабізацыя насельніцтва.

Дзяржава Абасідаў. Ператварэнне халіфата ў ісламскую ваенную дзяржаву. Заснаванне Багдада. Ураўненне ў правах мусульман рознага этнічнага паходжання. Стварэнне наемнай арміі і яе прафесіяналізацыя. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага ладу дзяржавы Абасідаў. Віды зямельнай маёмасці. Роль горада ў гаспадарчым жыцці. Арабскі гандаль і рамествы. Арабскія прыправы, араматычныя рэчывы і шаўковыя тканіны як важнейшыя тавары еўрапейскага попыту. Асаблівасці прававога становішча насельніцтва. Распад халіфата. Адносіны мусульман і крыжакаў. Мясцовыя дынастыі і іх стасункі з манголамі і туркамі.

### *Тэма 26. Дасягненні арабскай сярэднявечнай культуры*

Спецыфіка развіцця культуры арабскіх тэрыторый. Высокі статус ведаў. Імкненне правіцеляў да накаплення навуковай інфармацыі і пераклад на арабскую мову навуковых прац. Працы па адукацыі і выхаванню Ібн Сіны, філасофскія творы Ібн-Рушда (Аверраэса) і г.д.. Развіццё матэматыкі (Абу-л-Ваф, Амар Хаям, Ібн-Аль-Хаям), геаграфіі, мараходства, астраноміі, хіміі, агранамічных ведаў, ваеннай справы і г.д. Развіццё арабскай медыцыны. Медыцынскія трактаты (Абу Бакар Мухамед ар Разі, Ібн Сіна і г.д.). Тэхнічныя вынаходніцтвы арабаў. Філалагічная, гістарычная, біяграфічная літаратура. Тэрміны арабскага паходжання ў еўрапейскай навуцы.

Арабская літаратура. “Кніга песень” Абу-ль-Фараджа Аль-Ісфахані, паэзія Абу-ль-Ала аль Маары як узор  жанра для Усходу, казкі “Тысячы і адной ночы”, паэзія Фірдоусі, Амара Хайяма, Джамі. Выяўленчае мастацтва і архітэктура арабскіх краін. Музыка і музычныя інструменты. Спорт і сакалінае паляванне. Паўсядзеннае жыццё. Жылле і адзенне. Дабраўпарадкаванне гарадоў. Будаўніцтва лазняў і гігіена.

### *Тэма 27. Стварэнне Мангольскай дзяржавы і яе заваёвы*

Першыя звесткі аб манголах. Плямёны шывэй. Тэрмін “татары”. “Тайная гісторыя манголаў”. Узвышэнне Цемучжына. Сход мангольскай знаці на р. Анон і абвяшчэнне Цемучжына вярхоўным правіцелем з тытулам Чынгісхана.

Падрыхтоўка пахода на Сярэднюю Азію і захоп яе тэрыторыі. Заваяванне манголамі Кітая і ўсталяванне мангольскай дынастыі. Падпарадкаванне усходнеславянскіх зямель. Бітва на р. Калцы. Разарэнне Разані. Узяцце Кіева. Уварванне на Каўказ. Паход манголаў ва Ўсходнюю Еўропу. Падпарадкаванне часткі Ірана, уварванне ў Малую Азію і Блізкі Усход. Спроба пераправы манголаў ў Японію.

Будова мангольскай дзяржавы Ехе Мангол улус. Ваенная мадэль дзяржавы. Адміністрацыйны падзел і апарат кіравання. “Вялікая Яса”. Распад Мангольскай дзяржавы на чатыры улусы. Улус Джучы (Залатая Арда), Чагатая, Хулагу і Хубілая і іх геаграфічныя межы. Распад улуса Чагатая ў сярэдзіне XIV ст. Стварэнне дзяржавы Магулістан. Паходжанне Цімура. Заваёўніцкія паходы і стварэнне Цімурам імперыі са сталіцай у Самаркандзе. Цімур і Цімурыды. Распад імперыі. Кіраванне Улугбека і яго мецэнацтва. Аслабленне і распад Залатой Арды.

### *Тэма 28. Сярэднявечны Кітай*

Этнічны склад насельніцтва Кітая. Розніца ў геаграфічных умовах і развіцці паўночнага і паўдневага Кітая. Распаўсюджванне саманазвы “ханьцы”. Уяўленні еўрапейцаў аб Кітаі. Кантакты з цюркамоўнымі і манголамоўнымі качэўнікамі.

Распад імперыі Хань  на паўночную і паўднёвую. Эпоха шасці дынастый. “Шаснаццаць царстваў пяці паўночных пляменаў”. Паўднёвыя дынастыі і іх частая змена. Паўдневы Кітай як больш развіты ў эканамічных і культурных адносінах рэгіён.

Аднаўленне дзяржаўнай надзельнай сістэмы і стварэнне дзяржавы Суй. Раннефеадальны характар краіны і цэнтралізацыя. Масштабнае будаўніцтва. Войны імператара Ян-Дзі. Пераварот і падзенне дынастыі.

Дынастыя Тан. Завяршэнне працэса феадалізацыі. Росквіт дзяржавы. Характар імператарскай улады. Бюракратычная сістэма Кітая. Сістэма падрыхтоўкі чыноўнікаў. Структура грамадства. Сацыяльная і інтэлектуальная эліта. Воіны, земляробы, рамеснікі, гандляры. Заняпад дзяржаўнай надзельнай сістэмы. Сялянская вайна. Распал імперыі Тан.

Усталяванне дынастыі Сун і аб'яднанне краіны. Гаспадарчы ўздым. Барацьба з качэўнікамі. Манголы і Кітай. Дынастыя Юань. Пранікненне еўрапейцаў у Кітай.

### *Тэма 29. Дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры сярэднявечнага Кітая*

Рэлігійныя асновы кітайскай цывілізацыі. "Тры вучэння". Даасізм, будызм, канфуцыянства. Традыцыйныя асновы кітайскага грамадства. Адукацыя і яе роля ў грамадстве.

"Бліскучыя цемныя вякі" ў культуры Эпохі шасці дынастый. З'яўленне лірычнай паэзіі, партрэтнага, бытавога і пейзажнага жывапісу. Росквіт кітайскай паэзіі ў эпоху Тан (Мэн Хаожань, Ду Фу, Лі Бо, Бо Цзюйі і інш.). Жанр гарадской навэлы. Кітайскі жывапіс (жывапіс "кветак і птушак", "траў і насякомых"). Сімволіка кітайскай флоры і фауны. Мастацтва каліграфіі. Кітайская медыцына і алхімія. Матэматыка, астраномія, картаграфія, прыродазнаўства. Кітайская гістарыяграфія. Кітайская архітэктура.

Змяненні ў матэрыяльнай культуры паўночнага Кітая ў выніку стасункаў з качэўнікамі. З'яўленне крэслаў, верхавой язды, страменаў, малочных прадуктаў харчавання.

### *Тэма 30. Сярэднявечная Індыя*

Дзяржава Гуптаў у Індыі. Тэрытарыяльны і этнічны склад насельніцтва. Абшчынны лад, сістэма землеўладання, практыка "падараванняў". Нашэсце эфралітаў і распад імперыі Гуптаў. Дзяржава Харшы. Палітычная раздробленасць. Утварэнне Дэлійскага султаната. Варны і касты. Абшчына. Формы феадальнай уласнасці.

Стварэнне імперыі Вялікіх Маголаў у Індыі. Тэрытарыяльны склад імперыі. Цэнтралізаваная ўлада і чыноўніцтва. Дзяржаўная ўласнасць на зямлю. Удзельная вага прыватнага землеўладання. Гарады і гандаль. Рамествы. Кантакты з еўрапейцамі. Пранікненне партугальцаў і замацаванне іх у Індыі.

### *Тэма 31. Культура сярэднявечнай Індыі*

Індуізм і будызм. Індыйская філасофія і логіка. Развіццё матэматыных ведаў (Ар'ябхата), ўвядзенне дзесяцічнай сістэмы і прымяненне трыганаметрычных функцый. Запазычванне арабавмі індыйскага напісання лічбаў. "Арабскія лічбы" у Еўропе. Індыйская медыцына. Аюрведа. Індыйская хірургія, рынапластка, акушэрства і г.д. Патрабаванні да ўрача.

Індыйская паэзія (Калідаса). Прыдворная літаратура. Індыйскі эпас. Індыйскае мастацтва танца і яго сімволіка. Асаблівасці індыйскай музычнай культуры. Мастацтва і архітэктура Індыі. Храмы і манументальная скульптура. Тэатр.

### *Тэма 32. Сярэднявечная Японія*

Геаграфічнае становішча рэгіёна і асаблівасці этнічнага складу насельніта. Гаспадарчыя заняткі насельніцтва і этнічныя міграыі ў рэгіёене. Фарміраванне японскай дзяржавы. Распад радавога ладу. Барацьба родаў і перамога роду Сога. “Табель 12 рангаў” і “Закон 17 артыкулаў”. Падзенне роду Сога і прыход да ўлады роду Сумерагі.

“Пераварот Тайка”. З’яўленне сучаснай назвы краіны. Складанне раннефеадальнай дзяржавы. Масштабнае рэфармаванне. Панаванне надзельнай сістэмы. Сацыяльная структура японскага грамадства. З’яўленне прыватнага сектара землеўладання і заняпад дзяржаўнай надзельнай сістэмы.

Перыяд Хэйан і ўсталяванне ўлады рода Фудзівара. Распыленасць імператарскай улады. Дамінаванне прыватнага землеўладання. З’яўленне прафесійнай арміі і прыватных дружын. Утварэнне салоўя самураяў і самурайскі кодэкс гонару.

Падзенне гегемоніі Фудзівара. Барацьба родаў Тайра і Мінамота. Прыход да ўлады Мінамота Ёрытома  і наданне яму тытула сёгуна. Асаблівасці ўлады сёгуна. Саперніцтва ваенных і князёў (даймё). Міжусобіцы і прыход да сёгунскай улады Асікага Такаудзі. Раскол краіны. Падзенне прыдворнай арыстакратыі і павялічэнне вагі ваеннага саслоўя. Паўстанні супраць улады роду Асакага. Міжусобіцы і раздробленасць краіны. Пранікненне ў Японію еўрапейцаў.

### *Тэма 33. Культура сярэднявечнай Японіі*

Сінтаізм і будызм. Асаблівасці рэлігіі сінта. Запазычанні Японіяй кітайскіх ўзораў ў галіне палітычнага ладу і культуры. Стварэнне афіцыйнага зводу гісторыі краіны. Гістарычныя хронікі “Ніхонгі” і Кадзікі”.

Японская паэзія і першыя яе ўзоры. Хокку і танка.. Жанры японскай паэзіі. Японская літаратура. Анталогія “Ман’ёсю”. З’яўленне гісторыка-гераічных аповесцяў (“Аповесць аб доме Тайра”). Прыдворная літаратура. Лірычныя дзённікі: Сэй Сёнагон (“Нататкі ля ўзгалоўя) і г.д. Апавядальны раман (“Гэндзі манагіціры”).

Каноны і жанр японскага жывапісу. Мастацтва ікэбаны. Японская каліграфія. Музычныя жанры. Таэтр “ноо” і “кабукі”. Японская харэаграфія. Японская архітэктура.

### *Тэма 34. Дакалумбава Амерыка, яе матэрыяльная і духоўная культура*

Асяродкі старажытных амерыканскіх культур. Мезаамерыка і Цэнтральныя Анды. Прыродныя ўмовы і гаспадарчыя культуры. Зараджэнне земляробства і засяленне тэрыторый. Цывілізацыі альмекаў, сапатэкаў і майя. Перанясенне цэнтра цывілізацыі майя на Юкатан і ўстанаўленне там

майянскай гегемоніі. Сацыяльная структура дзяржавы майя. Абшчынны лад. Гарады-дзяржавы. Рэлігія майя.

Цывілізацыя тальтэкаў у Цэнтральнай Мексіцы. Ацтэкі і заснаванне г. Ценачцітлан. Дасягненне ацтэкамі гегемоніі. Гаспадарчыя заняткі ацтэкаў. Разлажэнне радавога ладу. Дасягненні культуры ацтэкаў. Архітэктура і скульптура. Каляндар. Пісьменнасць. Рэлігія ацтэкаў. Пантэон багоў. Ахвярапрынашэнні. Тэрытарыяльныя заваёвы ацтэкаў.

Цывілізацыі Андскага нагор’я і ўзбярэжжа Ціхага акіяна. Культуры чавін, мачыка і наска. Дзяржава Чыму і пакарэнне яе інкамі. Кіраванне дзяржавай інкаў і інкскія правіцелі. Сацыяльны лад і эканоміка дзяржавы інкаў.

З’яўленне еўрапейцаў і лёс дакалумбавых цывілізацый.

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | семінары | | |
| Уводзіны. Сярэднявечча ў сусветна-гістарычным працэсе. Перыядызацыя і асноўныя паняцці | 2 | | | |
| **Раздзел I. Еўропа ў перыяд Сярэднявечча (V–XV ст.)** | | | | |
| Тэма 1. Еўропа падчас “вялікага перасялення народаў”. Стварэнне і развіццё варварскіх каралеўстваў. | 2 | | | |
| Тэма 2. Англія да нарманскага заваявання | 2 | | 1 | апытанне, даклады |
| Тэма 3. Дзяржава франкаў, яе ўзнікненне, развіццё і распад. | 2 | | | |
| Тэма 4. Грамадскі лад і сацыяльныя адносіны франкаў паводле “Салічаскай праўды” | | 2 | | |
| Тэма 5. Эканамічнае і сацыяльнае развіццё Еўропы ў X–XV ст. | 2 | | 1 | апытанне, калоквіум |
| Тэма 6. Сярэднявечныя гарады | | 2 | | |
| Тэма 7. Італія ў XI–XV ст. | 2 | | | |
| Тэма 8. Германскія землі ў XI–XV ст. | 2 | | | |
| Тэма 9. Англія ў XI–XV ст. | 2 | | | |
| Тэма 10. Францыя ў XI–XV ст. | 2 | | 1 | апытанне, калоквіум |
| Тэма 11. Іспанія ў XI–XV ст. | | 2 | | |
| Тэма 12. Каталіцкая царква і папства ў XI–XV ст. | 2 | | | |
| Тэма 13. Крыжовая паходы | 2 | | | |
| Тэма 14. Скандынаўскія краіны ў Сярэднявечча. Варагі і Русь. | | 2 | | |
| Тэма 15. Кіеўская Русь (Старажытнаруская дзяржава) у IX–XIII ст. | | 2 | 1 | апытанне, даклады |
| Тэма 16. Маскоўская Русь у XIII–XV ст. | | 2 | | |
| Тэма 17. Еўрапейская культура ранняга і высокага Сярэднявечча | | | 1 | рэфераты, калоквіум |
| Тэма 18. Еўрапейская культура позняга Сярэднявечча | | | 1 | апытанне, даклады |
| Тэма 19. Культура ранняга еўрапейскага | 2 | | | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Адраджэння | | | | |
| Тэма 20. Руская культура X–XV ст. | | | 1 | апытанне, даклады |
| Тэма 21. Узнікненне і развіццё славянскіх краін у раннім і высокім Сярэднявеччы | | 2 | | |
| Тэма 22. Славянскія краіны ў познім Сярэднявеччы | | 2 | | |
| Тэма 23. Візантыя ў V–XV ст. | 2 | | | |
| Тэма 24. Культура Візантыі | | | 1 | рэфераты, апытанне |
| **Раздзел ІІ. Нееўрапейскія цывілізацыі ў Сярэднявеччы** | | | | |
| Тэма 25. Арабы. Узнікненне іслама. Стварэнне Арабскага халіфата | 4 | | | |
| Тэма 26. Дасягненні арабскай сярэднявечнай культуры | | | 1 | рэфераты, калоквіум |
| Тэма 27. Стварэнне Мангольскай дзяржавы і яе заваёвы | 2 | | | |
| Тэма 28. Сярэднявечны Кітай | 2 | | | |
| Тэма 29. Дасягненні матэрыяльнай і духоўнай культуры сярэднявечнага Кітая | | | 1 | рэфераты, калоквіум |
| Тэма 30. Сярэднявечная Індыя | 2 | | | |
| Тэма 31. Культура сярэднявечнай Індыі | | | 1 | рэфераты, калоквіум |
| Тэма 32. Сярэднявечная Японія | 2 | | | |
| Тэма 33. Культура сярэднявечнай Японіі | | | 1 | рэфераты, калоквіум |
| Тэма 34. Дакалумбава Амерыка, яе матэрыяльная і духоўная культура | | 2 | | |
| **Усяго** | **38** | **18** | **12** | |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная*

1.Дворниченко, А. Ю. История России : учебник / А. Ю. Дворниченко, Ю. В. Тот, М. В. Ходяков. – Москва : Проспект, 2006. – 472 с.

2.Кузьмин, А. Г. История России с древнейших времен до 1618 г. : учебник для студентов вузов. В 2 кн. Кн. 2 / А. Г. Кузьмин ; под общ. ред. А. Ф. Киселева. – Москва : ВЛАДОС, 2004. – 463, [1] с. – (Учебник для вузов).

3.История средних веков : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по направлению и специальности "История". [В 2 т.]. Т. 1 / под ред. С. П. Карпова ; [ред. кол.: М. А. Бойцов и др.]. – 2-е изд. – Москва : ИНФРА-М : МГУ, 2000. – 638, [1] с. - Библиогр.: с. 615–637.

4.История средних веков : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по направлению и специальности "История". [В 2 т.]. Т. 2. Раннее новое Время / под ред. С. П. Карпова ; [редкол.: Л. М. Брагина и др.]. – Москва : ИНФРА–М : МГУ, 2000. – 430, [1] с. : карты.

5.Трусаў, А. А. Гісторыя сярэднявечнай Еўропы (V–XV стагоддзі) / Алег Трусаў. – Выд. 2-е, папраўл. – Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2017. – 354, [1] с. : іл. ; 20x15 см. – Бібліягр.: с. 345–346 (19 назваў) і ў канцы раздз.

*Дадатковая:*

1. *Будур, Н.В.* Повседневная жизнь викингов. IX – XI века / Н.В. Будур; предисл. авт. – М. : Мол. гвардия, 2007. – 463 с.

2. *Бэшем, А.* Цивилизация Древней Индии/Артур Бэшем: пер. с фр. Е. Гавриловой под ред. И. Шевченко.–Екатеринбург: У-Фактория, 2007. – 496 с.

3. *Всемирная история.* В 6 т. Том 2. Средневековые цивилизации Запада и Востока / Ин-т всеобщей истории РАН; гл. ред. О. А. Чубарьян – М. : Наука, 2012. – 894 с.

4. *Гийу, А.* Византийская цивилизация / Андре Гийу; пер. с франц. Д. Лоевского; Предисл. Р. Блока. – Екатеринбург: У-Фактория, 2005. – 552 с.

5. *Елисеефф, В., Елисеефф, Д.* Цивилизация классического Китая / В. Едисеефф, Д. Елисеефф; пер с франц. Д. Лоевского – Екатеринбург: У-Фактория, 2007. – 640 с.

6. *Елисеефф, В., Елисеефф, Д.* Японская цивилизация / В. Елисеефф, Д. Елисеефф. – Пер. с фр. И. Эльфонд. – Екатеринбург: У-Фактория, 2005. – 526 с.

7. *Ле Гофф, Ж.* Цивилизация средневекового Запада / Жак Ле Гофф; Пер. с фр. Под общ. ред. В.А. Бабинцева; послесл. А.Я. Гуревича. – Екатеринбург: У-Фактория, 2007. – 560 с.

8. *Мартынюк, А. В.* Средневековая Русь: Хрестоматия: учеб. пособие для студ. учреждений высш. образования по историческим спец. : в 2 ч. / А. В. Мартынюк. – Минск, РИВШ, 2012.

9. *Нерсесов, Я.*Н. Доколумбова Америка: ацтеки, майя, инки / Я.Н. Нерсесов. – М. : Мир энциклопедий Аванта+, Астрель; Владимир: ВКТ, 2009. – 446 с.

10. *Пастуро, М.* Символическая история европейского средневековья / Мишель Пастуро. – Пер. с фр. Е. Решетниковой. – СПб. : Александрия, 2017. – 448 с.

11. *Пти-Дютайи, Ш.* Феодальная монархия во Франции и в Англии X–XIII вв. / Шарль Пти-Дютайи; репринтное издание. – Минск: А.Н. Вараксин, 2010. – 424 с.

12. *Средневековый мир* в терминах, именах и названиях: Словарь-справочник / Науч. ред. В. А. Федосик. Сост. Е. Д. Смирнова. – 2-е изд., испр. – Минск : Беларусь, 2001. – 383 с.

13. *Уваров, П. Ю.* Китай в средневековом мире. Взгляд из всемирной истории / П. Ю. Уваров, А. Л. Рябинин. – СПб. : Наука, 2017. – 286 с.

14. *Флори, Ж.* Повседневная жизнь рыцарей в средние века / Жан Флори; пер. с фр. Ф.Ф. Нестерова. – М. : Молодая гвардия, 2006. – 356 с.

15. *Штокмар, В.В.* История Англии в средние века / В.В. Штокмар. – М. : Алетейя, 2005. – 203 с.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і кантролю самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў накіравана на:

- якаснае засваенне і сістэматызацыю атрыманых тэарэтычных ведаў;
- фарміраванне ўменняў па складанню і апрацоўцы розных відаў дакументацыі;
- фарміраванне навыка эфектыўнага пошуку інфармацыі ў фондах архіўных устаноў;
- фарміраванне ўмення выкарыстоўваць атрыманыя веды ў навукова-фондавай дзейнасці музейных устаноў і ў рабоце устаноў краязнаўча-турыстычнай сферы;
- замацаванне практычных уменняў студэнтаў;
- фарміраванне самастойнай думкі;
- развіццё навекова-даследчых навыкаў і ўменняў.

Кантроль самастойнай работы студэнтаў можа ажыццяўляцца на лекцыях, семінарах, спецыяльна арганізаваных калоквіумах, а таксама падчас залікова-экзаменаыйнай сесіі. Формамі кантролю з'яўляюцца індывідуальнае і франтальнае апытанне, стварэнне праблемных сітуацый і пастаноўка перад аўдыторыяй задач "мазгавога штурму", фармуляванне аўдыторыяй пытанняў у рэчышчы вывучаемай тэмы, стварэнне прадстаўленне міні-дакладаў і рэфератаў, выкананне тэстаў і г.д.

## Рэкамендуемыя метады (тэхналогіі) навучання

Асноўнымі метадамі і тэхналогіямі навучання, якія адпавядаюць задачам вывучэння дадзенага абавязковага модуля, з'яўляюцца:

1) метады праблемнага навучання (праблемнае выкладанне, часткова пошукавы і даследчыцкі метады);

2) асобасна арыентаваныя (развіваючыя) тэхналогіі, заснаваныя на актыўных (рэфлексійна-дзейнасных) формах і метадах навучання ("мазгавы штурм", дзелавая, ролевая і імітацыйная гульня, дыскусія, прэс-канферэнцыя, навучальныя дэбаты, круглы стол, кейс-тэхналогія, праект і інш.);

3) інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі, якія забяспечваюць праблемна-даследчы характар працэсу навучання і актывізацыю самастойнай працы студэнтаў (структураваныя электронныя прэзентацыі для лекцыйных заняткаў, выкарыстанне аўдыё-відэападтрымкі вучэбных заняткаў (аналіз аўдыё-, відэасітуацый і інш.), распрацоўка і прымяненне на аснове камп'ютэрных і мультымедыйных сродкаў гістарычных творчых заданняў, дапаўненне традыцыйных навучальных заняткаў сродкамі ўзаемадзеяння на аснове сеткавых камунікацыйных магчымасцяў (інтэрнэт-форму, інтэрнэт-семінар і г.д.);

Па кожным раздзеле і тэме дадзенай вучэбнай праграмы ў адпаведнасці з іх мэтамі і задачамі выкладчыкам (кафедрай) праектуюцца і рэалізуюцца пэўныя педагагічныя тэхналогіі. У ліку найбольш перспектыўных і

эфектыўных сучасных інавацыйных адукацыйных сродкаў і тэхналогій, якія дазваляюць рэалізаваць сістэмна-дзейнасны кампетэнтнасны падыход у вучэбна-выхаваўчым працэсе, варта вылучыць: вучэбна-метадычныя комплексы (у тым ліку электронныя), варыятыўныя мадэлі самастойнай працы студэнтаў, блочна-модульныя, модульна-рэйтынгавыя і крэдытныя сістэмы, інфармацыйныя тэхналогіі, метад кейсаў, методыкі актыўнага навучання.

## Дыягностыка сфармаванасці кампетэнцый стулдэнта

### 1. Патрабаванні да ажыццяўлення дыягностыкі

Працэдура дыягностыкі сформіраванасці кампетэнцый стіудэнтаў ўключае наступныя этапы:

- вызначэнне аб’екта дыягностыкі;
- выяўленне факта вучэбных дасягненняў студэнта з дапамогай крытэрыяльна-арыентаваных тэстаў і іншых сродкаў дыягностыкі;
- вымярэнне ступені адпаведнасці вучэбных дасяненняў студэнтаў патрабаванням адукацыйнага стандарта;
- ацэньванне вынікаў выяўлення і вымярэння адпаведнасці вучэбных дасягненняў студэнта патрабаванням адукацыйнага стандарта (з дапамогай шкалы ацэнак).

## Рэкамендаваныя сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў прадугледжвае падрыхтоўку студэнтамі інфармацыйных матэрыялаў па ўсеагульнай гісторыі. Для дыягностыкі кампетэнцый студэнтаў прадугледжваецца выкарыстанне наступных сродкаў дывягностыкі:

- тэсты з выкарыстаннем заданняў адкрытай і закрытай формы па асобных раздзелах і тэмах, а таксама па дысцыпліне ў цэлым;
- пісьмовыя заданні па асобных раздзелах дысцыпліны;
- вуснае апытанне падчас заняткаў;
- выступленні студэнтаў на семінарскіх занятках па распрацоўваемых імі тэмах;
- падрыхтоўка і абарона рэфератаў.

### 2. Шкала ацэнак

Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў на экзаменах па дысцыплінах сацыяльна-гуманітарнага цыкла праводзіцца па дзесяці бальнай шкале. Ацэнка вучэбных дасягненняў студэнтаў ажыццяўляецца паэтапна па канкрэтных раздзелах (тэмах) вучэбнай дысцыпліна, здзяйсняецца кафедрай у адпаведнасці з абранай установай вышэйшай адукацыі шкалой ацэнак.

**3. Крытэрыі ацэнак**

Для ацэнкі вучэбных дасягненняў студэнтаў выкарыстоўваюцца крытэрыі, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Пытанні для самастойнай работы студэнтаў**

1. Якое значэнне мела прыняцце хрысціянства як афіцыйнай рэлігіі дл познерымскана грамадства?
2. Што ўяўляла сабой хрысціянства ў канцэптуальных адносінах у раннім сярэднявеччы?
3. Чым можна растлумачыць розныя інтэрпрэтацыі хрысціянскага веравучэння ў познерымскую эпоху і ранняе сярэднявечча?
4. Чым адрозніваліся адносіны паміж духоўнай і свецкай уладавй у Візантыі і былой Заходняй рымскай імперыі?
5. Што было агульнага і ў чым адрозніваліся ў плане дагматыкі, абраднасці і арганізацыі хрысціянскія цэрквы на Захадзе і Усходзе?
6. Што такое Вялікая схізма і якое значэнне яна мела для далейшага развіцця еўрапейскай цывілізацыі?
7. Якія тэрыторыі ўключаў Арабскі халіфат?
8. На прыкладзе якіх краін можна яскрава ўбачыць сінтэз мясцовай і арабскай традыцыі.?
9. Што садзейнічала інтэнсіўным кантактам арабскіх краін з іх сусудзямі?
10. Чым было выклікана развіцце ў Арабскім халіфаце дакладных навук і адпаведнай тэхнікі?
11. Якія дасягненні арабскай матэматыкі вы можаце назваць?
12. Чым было выклікана інтэнсіўнае развіцце астраноміі у арабаў?
13. Якія вы ведаеце дасягненні ў гэтай галіне?
14. Медыцынскія дасягненні якіх краін сінтэзіравала арабская медыцына?
15. Якія найбольш значныя дасягненні арабскай медыцыны вы можаце назваць?
16. Якім чынам уплываў іслам на выяўленчае мастацтва? Што ў ім набыло большае развіцце і чаму?
17. Якія прыклады арабскай літаратуры вы ведаеце?
18. . Каго з арабскіх аўтараў вы можаце назваць?
19. Як культурныя дасягненні арабаў уплывалі на развіцце Еўропы?
20. Чым можна растлумачыць рэлігійны фундамент еўрапейскай сярэднявечнай цывілізацыі?
21. Ці была якая-небудзь іншая альтэрнатыва рэлігійнай будове свету?
22. Назавіце найбольш вядомыя творы літаратуры і мастацтва сярэднявечча, якія яскрава ўвасабляюць рэлігійную аснову.
23. Калі і чамуназіраецца ўздым гарадскога рамана і гарадской паэзіі?
24. .Што такое куртуазная літаратура?

25.6.Што такое аналы і хронікі? Як гэтыя творы называліся ва ўсходнеславянскіх землях?
26.Чым было абумоўлена з’яўленне універсітэтаў?
27.Якім быў статус універсітэтаў у сярэднявечным грамадстве?
28.Якія дысцыпліны і чаму вывучаліся ў сярэднявечных універсітэтах?
29. Што такое схаластыка і якое значэнне яна мела(
30. Што такое “град зямны” і “град нябесны”?
31. Што змянілася ў становішчы каталіцкай царквы на працягу сярэднявечча?
32.. Як мяняліся ўзаемаадносіны духоўнай і свецкай улады?
33. Чаму адбываўся гэты працэс?
34. Па якой прычыне ў каталіцкай царкве наспелі крызісныя з’явы і ў чым яны прыяўляліся?
35. Якую мэту меў клюнійскі рух?
36.Як звязаны клюнійскі рух з умацаваннем пазіцый каталіцкай царквы?
37. Які ўклад унесла культура сярэднявечча ў еўрапейскую культуру і якое значэнне мела для наступных этапаў развіцця?
38.Якія прыклады ўздыму сярэднявечнай культуры, адзначаемыя як адраджэнне, вы ведаеце?
39.Чаму менавіта ў Італіі пачаўся культурны ўздым у перыяд позняга Сярэднявечча?
40.Што змянілася ва ўсветаўспрыняцці еўрапейцаў пад уплывам ідэй гуманізма?
41.Якім чынам у перыяд Рэнесанса змянілася стаўленне да мастацтва?
42.Каго з прадстаўнікоў ранняга Адраджэння вы ведаеце?
43.У чым адрозненні ментальнасці і светаўспрыняцца на Захадзе і Усходзе?
44.Што такое традыцыйнае грамадства?
45.Якім чынам каноны традыцыйнага грамадства увасобіліся ў рэлігійных сістэмах Кітая, Японіі і Індыі?
46.Што сведчыць аб асобай засяроджанасці ўспрыняцця свету, прыроды і месца ў іх чадавека на прыкладзе культуры Кітая і Японіі?
47.У чым заключаецца асаблівы ўнесак індыйскай матэматыкі ў сусветную культуру?
48.Якія спецыфічныя рысы японскай паэзіі сведчаць аб асобным светаўспрыняцці і разуменшу думкуні прыроды японскімі аўтарамі?
49.У чым адрозненні тэатра “ноо” і “кабукі”?
50.Якія, на вашу думку, дывілізацыйныя і культурныя асаблівасці перадумовілі гібель дакалумбавых цывілізвцый у сутыкненні з еўрапейцамі?